6. **Bell, S. J.** The blended librarian. The blueprint for redefining the teaching and learning role of academic librarians [Electronic resource] : College & Research Libraries / S. J. Bell. – July/Aug. – 2004. – Mode of access: https://crln.acrl.org/index.php/ crlnews/article/download/7297/7297. – Date of access: 10.08.2018.

7. **CRAI** Universitat de Barcelona [Electronic resource] : Espai del tactic. – Mode of access: http://docenciacrai.ub.edu/. – Date of access: 10.08.2018.

*Анализируется проблема определения приоритетного набора стратегических кейсов деятельности современной университетской библиотеки в условиях перехода к студентоориентированным моделям преподавания, а также расширения практики применения дистанционных форм обучения. Приведены некоторые успешные примеры, реализуемые в Беларуси, а также в библиотеках ведущих зарубежных университетов.*

*The problem of identification of priority cases set strategic activities of modern university library in the transition to student-oriented teaching models, as well as increased use of distance learning are analyzed. Are some successful examples, which are implemented in Belarus, as well as in the library of the leading foreign universities.*

***Зыгмантовіч Святлана Вікенцьеўна***
***Саітава Валянціна Іванаўна***
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

## ВУЧЭБНАЯ КНІГА ПА АГУЛЬНЫМ БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВЕ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ ПРАФЕСІЙНАЙ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Значнае месца ў структуры прафесійнай бібліятэчнай адукацыі належыць вучэбнай кнізе, якая не толькі акумулюе і забяспечвае перадачу назапашаных ведаў і вопыту бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, але і садзейнічае гісторыка-бібліятэчнаму і гіс-

торыка-бібліяграфічнаму пазнанню, паколькі вучэбную кнігу можна разглядаць у некалькіх аспектах: як друкаванае выданне, у якім змяшчаецца сукупнасць сістэматызаваных і рэдуцыраваных ведаў па навуковай галіне і апарату арганізацыі засваення гэтых ведаў; крыніцу вучэбна-навуковай інфармацыі; дыдактычны сродак, які забяспечвае на інфармацыйным і метадычным узроўнях тэарэтычную падрыхтоўку будучага бібліятэкара да прафесійнай дзейнасці.

Сучасны этап развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі, накіраваны на актыўнае ўкараненне інавацыйных тэхналогій навучання, засваенне такіх канцэптуальных асноў адукацыі, як асобасна-арыентаваны, практыка-арыентаваны, дзейнасны падыходы, пераход да праблемнага прынцыпу арганізацыі навучання, з аднаго боку, выклікае глыбокія пераўтварэнні ў сістэме вучэбнай кнігі, з другога – актуалізуе вывучэнне і канструктыўнае прымяненне гістарычнага вопыту падрыхтоўкі вучэбных выданняў.

У адукацыйныя праграмы падрыхтоўкі бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў ва ўстановах вышэйшай адукацыі ўведзена вывучэнне дысцыплін агульнага бібліяграфазнаўства, якія фарміруюць прафесійную кампетэнтнасць будучых спецыялістаў па праблематыцы тэорыі, гісторыі, метадалогіі, арганізацыі, методыкі і тэхналогіі бібліяграфіі ў цэлым. Пералічаныя дысцыплінарныя кірункі прызначаны закласці ў студэнтаў фундамент ведаў аб такой складанай грамадскай сістэме, як бібліяграфія, фарміруюць здольнасць выяўляць і аналізаваць бібліяграфічныя з'явы, тлумачыць іх сутнасць, авалодваць бібліяграфічнымі сродкамі забеспячэння інфармацыйных патрэб грамадства, бачыць перспектывы развіцця бібліяграфіі, умець вырашаць бібліяграфічныя праблемы, рыхтаваць бібліяграфічныя прадукты і рэалізоўваць бібліяграфічныя паслугі.

Стварэнне падручнікаў, прысвечаных дысцыплінам агульнага бібліяграфазнаўства, звязана з рэалізацыяй іх аўтарамі асабліва высокіх патрабаванняў. М.Г. Вохрышава, разглядаючы расійскае вучэбнае выданне па агульным бібліятэказнаўстве, прыйшла да высновы, што забеспячэнне высокага навуковага ўзроўню ў такіх падручніках патрабуе ад аўтараў бачыць тэарэтычнае поле навукі ў цэлым, выяўляць і фармуляваць самыя агульныя і грунтоўныя ідэі і тэндэнцыі развіцця. Размова вядзецца аб філасофскім асэнса-

ванні навуковай дысцыпліны, калі аўтар павінен займаць метанавуковую пазіцыю, нібы падняцца над усім аб'ёмам ведаў, створаных у дадзенай галіне, ацаніць стан навукі і пераўтварыць яго [1].

Менавіта падручнікі ў сістэме вышэйшай адукацыі забяспечваюць фундаментальнасць падрыхтоўкі праз адлюстраванне найбольш каштоўнай часткі тэарэтычных, гістарычных, тэхналагічных, метадычных і арганізацыйных ведаў, запатрабаваных у сучаснай бібліяграфічнай дзейнасці. Значнасць падручнікаў па вучэбных дысцыплінах грунтуецца таксама на тым, што менавіта гэты від вучэбнай літаратуры выступае ў якасці мадэлі адукацыйнага працэсу, дазваляе забяспечыць сістэматычнасць прадстаўлення матэрыялу; характарызуецца ўпарадкаванай лагічнасцю падачы матэрыялу; стварае базу для першапачатковага засваення прафесійных ведаў і адначасова з'яўляецца інтэлектуальным інструментам для кіравання працэсам пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па авалоданні зместам адукацыі і прадуктыўным выкарыстанні засвоеных ведаў у вырашэнні практычных задач рознай маштабнасці, накіраванасці і ступені цяжкасці.

Наяўнасць вучэбных дапаможнікаў па ўсіх раздзелах агульнага бібліяграфазнаўства, падрыхтаваных на агульных метадалагічных падыходах, спалучэнне падручнікаў па гісторыка-тэарэтычных дысцыплінах з прыкладнымі дысцыплінамі тэхналагічнай накіраванасці дазваляюць забяспечыць фарміраванне сістэмнага набору сацыяльна-прафесійных бібліяграфічных кампетэнцый спецыялістаў, рэалізаваць аб'ектыўныя патрабаванні сучаснай «эканомікі ведаў», у якой больш значнымі для паспяховай прафесійнай дзейнасці лічацца не разрозненыя веды, а сістэмныя, з магчымасцю атрымання сінергетычнага эфекту ад іх выкарыстання ў працэсе навучання.

Цэласнае прадстаўленне бібліяграфазнаўства на вучэбным узроўні мае вялікае значэнне для прафесіі. Яно дазваляе атрымаць агульнае прадстаўленне аб бібліяграфічнай дзейнасці, дае магчымасць ідэнтыфікаваць і адрозніваць яе. Сёння гэта асабліва актуальна ў сувязі з тым, што ў бібліятэках узнікаюць новыя віды дзейнасці, звязаныя з аўтаматызацыяй і ўкараненнем сучасных інфармацыйных тэхналогій. Цэласнае бачанне бібліяграфічнай дзейнасці неабходна для кіравання ўсёй разнастайнасцю яе відаў,

арганізацыйных структур, распрацоўкі іх класіфікацыі, адказу на пытанне аб захаванні або змяненні сутнасці гэтай дзейнасці ў сувязі з тэхналагічнымі і сацыяльна-культурнымі зменамі.

У дзеючым адукацыйным стандарце «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)» [2] бібліяграфічная складаючая страціла сваю чысціню і аўтаномнасць, але дадзеная тэндэнцыя не павінна разглядацца як знікненне бібліяграфічных форм дзейнасці, бібліяграфічных працэсаў і сродкаў.

Гістарычны ракурс выяўляе, што вытокі вучэбнай кнігі па бібліяграфіі адносяцца да агульнай бібліяграфічнай сістэмы, якая ахоплівае ўсе арганізацыйна-аформленыя структуры стварэння і функцыянавання бібліяграфічнай інфармацыі ў грамадстве. Так, першай айчыннай вучэбнай кнігай па агульным бібліяграфазнаўстве былі лекцыі «Rzecz o bibliografii powszechnej…» [3], напісаныя А.М. Багаткевічам (ураджэнцам Пастаўшчыны), які выкладаў дысцыпліну «Усеагульная бібліяграфія» студэнтам факультэта літаратуры і вольных мастацтваў у Імператарскім Віленскім універсітэце ў 1829–1831 гг. У рэчышчы распаўсюджанага ў той час кнігазнаўчага падыходу аўтар знаёміў студэнтаў з тлумачэннямі паняцця «бібліяграфія», асвятляў структуру бібліяграфіі, яе значнасць, характарызаваў шматлікія бібліяграфічныя крыніцы. З'яўленне такой працы магчыма разглядаць як вытокі будучай сістэмы фарміравання ў студэнтаў інфармацыйнай культуры, станаўленне якой адбудзецца менавіта на комплексе бібліяграфічных ведаў і ўменняў, неабходных спецыялісту любой грамадскай сферы.

Але сапраўдны імпульс стварэнне вучэбнай кнігі атрымала ў сувязі з развіццём прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў у XX ст., калі ў адказ на грамадскія патрэбы пачалося імклівае развіццё бібліятэк розных тыпаў і відаў. Менавіта ў межах бібліятэчнай бібліяграфіі ствараліся бібліяграфічныя матэрыялы, назапашваліся некаторыя метадычныя, тэарэтычныя абагульненні, паступова высвятлялася роля чытача як аб'екта бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання. Усё гэта спрыяла выкрышталізацыі тэматыкі, якая ахоплівала самыя агульныя праблемы рэальнага функцыянавання і навуковага асэнсавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Падкрэсліваючы вядучую ролю бібліятэчнай бібліяграфіі, з функцыя-

наваннем якой пераважна звязавана развіццё бібліяграфічнай навукі і рэпрадуцыраванне яе вынікаў у сістэму бібліятэчнай адукацыі ў СССР, неабходна адзначыць, што тады, як і на сучасным этапе, падручнікі па агульным бібліяграфазнаўстве ствараліся таксама і для студэнтаў паліграфічнай і кнігагандлёвай галін.

У 1950-я гг. пачалося актыўнае развіццё тэарэтычных асноў бібліяграфіі як вучэбнай дысцыпліны, што ў далейшым прывяло да распрацоўкі грунтоўных агульнатэарэтычных канцэпцый бібліяграфіі: дакументаграфічнай А.П. Коршунава і інфармацыйна-кнігазнаўчай А.І. Барсука. Уздым тэарэтычнай работы, які быў дасягнуты дзякуючы ў першую чаргу даследаванням выкладчыкаў бібліяграфічных дысцыплін, лагічна знайшоў адлюстраванне ў падручніках па асноўнай фундаментальнай дысцыпліне – агульным курсе бібліяграфіі.

Забеспячэнне вучэбнымі выданнямі агульнага бібліяграфазнаўства ў сістэме вышэйшай адукацыі ў СССР пачалося з выпуску падручнікаў 1957 і 1969 гг. Падручнікі мелі выражаны комплексны характар, у якім адлюстроўваліся асноўныя аспекты бібліяграфазнаўства: студэнты знаёміліся з некаторымі паняццямі і тэрмінамі бібліяграфіі (яе задачамі, прынцыпамі, відамі і метадамі), з яе узнікненнем і развіццём, тагачасным станам, бібліяграфічным крыніцазнаўствам і бібліяграфічнай работай бібліятэкі. Структура і змест гэтых выданняў адлюстроўваюць ход вызначэння і навуковага асэнсавання праблематыкі, якая пазіцыяніравалася ў рэчышчы агульнага бібліяграфазнаўства, раскрываюць эвалюцыю дыдактычных рашэнняў для засваення вучэбнага матэрыялу.

Першы ў БССР вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «Краткие основы библиографии» быў апублікаваны М.Ц. Талкачовым у 1963 г. і таксама меў комплексны характар [4]. Вучэбны матэрыял дазваляў атрымаць веды аб сутнасці бібліяграфіі, яе задачах і арганізацыі ў СССР, бібліяграфічных крыніцах твораў заснавальнікаў марксізму-ленінізму і дакументаў КПСС, аб агульнай і галіновай бібліяграфіі, па методыцы бібліяграфічнага адшукання і складання бібліяграфічных спісаў. Яго адметнай рысай была наяўнасць самастойнага раздзела «Белорусская библиография» – гэта першы вопыт прадстаў-

лення тагачаснай беларускай бібліяграфіі ў вучэбным выданні. Цікава адзначыць, што, аддаючы належнае тагачасным ідэалагічным прыярытэтам, М.Ц. Талкачоў тлумачыць бібліяграфію як своеасаблівую «область культуры, научной и пропагандистской деятельности, назначением которой является всестороннее ориентирование различных кругов читателей в наличии и содержании произведений печати в целях обслуживания всех сторон культуры, науки, просвещения, производства, всех сторон общественной жизни» [4]. Адчувальныя ў гэтым паняцці вытокі стыхійнага дзейнаснага падыходу і вызначэння ролі бібліяграфіі ў сістэме шырокіх грамадскіх кантэкстаў.

Бясспрэчна, з сучасных пазіцый выяўляюцца недахопы тэарэтыка-метадалагічнай нераспрацаванасці бібліяграфазнаўства, абмежаванасць у раскрыцці складанай шматузроўневай структуры бібліяграфічнай дзейнасці.

Наступныя выданні былі падрыхтаваны вядомым беларускім бібліяграфазнаўцам В.Е. Лявончыкавым – гэта падручнікі «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» [5]. Асаблівасцю першага выдання (1983 г., на рускай мове) быў буйны раздзел, прысвечаны гісторыі беларускай бібліяграфіі. Упершыню ў кантэксце асноўных перыядаў гісторыі Беларусі была дадзена характарыстыка развіцця відаў бібліяграфіі, лепшых узораў бібліяграфічнай прадукцыі, працы выдатных бібліёграфаў. Матэрыял раздзела ў значнай ступені быў вынікам даследавання аўтарам і іншымі беларускімі даследчыкамі фактаў і з'яў мала вывучанай айчыннай гістарычнай спадчыны. Акрамя гістарычнага раздзела, у падручніку значнае месца займаў раздзел, прысвечаны арганізацыі беларускай бібліяграфіі (адпаведна часу падрыхтоўкі падручніка). Другое выданне падручніка (1991 г., на беларускай мове) змяшчала раздзел, прысвечаны тэарэтычным пытанням бібліяграфіі саюзных рэспублік – актуальнай праблеме савецкага бібліяграфазнаўства, у даследаванне якой В.Е. Лявончыкаў унёс значны асабісты ўклад. У падручніку раскрыты тэрміналагічныя пытанні, функцыянальна-відавая структура і іншыя асаблівасці рэспубліканскай бібліяграфіі. Асноўны змест быў прысвечаны гісторыі беларускай бібліяграфіі. У асобнай главе асвятлялася арганізацыя даведачна-бібліяграфічнага апарату ў бібліятэках БССР і бібліяграфічнае

абслугоўванне. Падручнікі «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» прызначаліся для забеспячэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская бібліяграфія», уведзенай як нацыянальны кампанент і як дадатак да базавай агульнапрафесійнай дысцыпліны «Бібліяграфія. Агульны курс».

Уздым бібліяграфазнаўства ў апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст., новы ўзровень метадалогіі, дасягненні плеяды таленавітых вучоных забяспечылі не толькі навуковы прарыў, але і спрыялі з'яўленню новых вучэбных выданняў па агульным бібліяграфазнаўстве. З выхадам падручнікаў А.П. Коршунава «Библиографоведение. Общий курс» (Москва, 1990), «Библиографическая работа в библиотеке: организация и методика» (Москва, 1990) актывізаваўся працэс вызначэння агульных навуковых ведаў ад бібліяграфазнаўства ў цэлым і да асобных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці. Спецыфікай навуковых ведаў і вучэбных выданняў па агульным бібліяграфазнаўстве стаў аспектны падыход, асновы якога закладаліся ў сярэдзіне XX ст. Адпаведна ў галіновым бібліяграфазнаўстве і вучэбных выданнях для падрыхтоўкі спецыялістаў усталяваўся аб'ектны падыход, які дазваляў разнастайны змест вывучаць у розных аспектах.

Пад уплывам дасягненняў бібліяграфічнай навукі і практыкі, узмацнення нацыянальна-культурнага характару прафесійнай бібліятэчнай адукацыі пачалося стварэнне новай вучэбнай кнігі. У 2000-я гг. выйшлі вучэбныя дапаможнікі па тэорыі, гісторыі, арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці.

Першы нацыянальны вучэбны дапаможнік «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя» Т.В. Кузьмініч [6] істотна адрозніваецца ад падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў вядомых савецкіх і расійскіх вучоных А.П. Коршунава, М.Г. Вохрышавай, В.А. Факеева і інш. У выданнях названых аўтараў прадстаўлена іх аўтарская канцэпцыя і мэтавая накіраванасць звязана з фарміраваннем кагнітыўнай складаючай падрыхтоўкі спецыялістаў. Напрыклад, мэта расійскага падручніка «Библиографоведение» А.П. Коршунава, Н.К. Лелікавай і Т.Ф. Ліхавід – «формирование у студентов теоретических представлений о сущности библиографии как общественного явления, основных закономерностях ее функционирования, структуре и месте в системе смежных областей деятельности, направле-

ниях развития библиографоведения» [7]. Адметнай характарыстыкай беларускага вучэбнага дапаможніка з'яўляецца поліканцэптуальнасць адлюстравання бібліяграфіі як грамадскай з'явы, што дае магчымасць студэнтам асэнсоўваць бібліяграфічныя з'явы з пазіцый розных канцэпцый. Немэтазгоднасць абмяжоўваць разгляд тэарэтычных аспектаў бібліяграфіі адным падыходам Т.В. Кузьмініч абаснавана тлумачыць не толькі дасягненнямі сучаснай тэарэтычнай думкі, але найперш тым, што «некаторыя кірункі, з'явы практычнай дзейнасці немагчыма ўпісаць у межы пэўнай канцэпцыі…» [8]. У прапанаваным вучэбным матэрыяле значны пласт складаюць звесткі пра электронныя формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі, якасна новыя формы бібліяграфічнага абслугоўвання, прыведзены шматлікія факты і прыклады з практыкі, асабліва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, што надае выданню практычную скіраванасць. Утрымлівае вучэбны дапаможнік вынікі тэарэтычных даследаванняў самога аўтара, сярод якіх дэфініцыі паняццяў бібліяграфічнай дзейнасці, абгрунтаванне паняцця транзітыўнасці для абазначэння адной з уласцівасцей бібліяграфічнай інфармацыі і адлюстравання яе сучаснай спецыфікі.

Выразнай адмысловасцю характарызуецца новы вучэбны дапаможнік «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» В.І. Саітавай, В.Е. Лявончыкава і Т.В. Кузьмініч [9]. Гэта першае выданне, у якім галоўныя раздзелы выдзелены на падставе асноўнага спосабу фіксавання ведаў на працягу пэўнага гістарычнага перыяду. Выкарыстаная перыядызацыя паказвае ўзаемаўплывы бібліяграфіі і сістэмы дакументных камунікацый, раскрывае асаблівасці захавання, перапрацоўкі і трансляцыі бібліяграфічнай інфармацыі, фарміравання структур бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, асаблівасці яе аб'екта, жанравай разнастайнасці прадукцыі, эвалюцыі методыкі і тэхналогій бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання. Адпаведна перыядызацыі ў асобных главах асвятляецца гісторыя айчыннай бібліяграфіі. Яны змяшчаюць таксама новы фактаграфічны матэрыял і высновы, атрыманыя аўтарамі вучэбнага дапаможніка. Такая падача вучэбнага матэрыялу спрыяе ўменням выкарыстоўваць гісторыка-бібліяграфічныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці, што актуальна для сучаснай адукацыі. Асаблівае значэнне ў кантэксце практыка-арыен-

таванага падыходу мае раздзел «Бібліяграфія ў перыяд развіцця лічбавых камунікацый», пры вывучэнні якога студэнты знаёмяцца з патэнцыялам нацыянальнай бібліяграфіі для верыфікацыі аўтарства і інфармацыйнага рэсурсу для стваральнікаў рознага праграмнага забеспячэння, з бізнес-мадэлямі рэсурсаў нацыянальнай бібліяграфіі, з сусветна вядомымі пастаўшчыкамі электронных інфармацыйных рэсурсаў па розных галінах ведаў, створанымі імі рэсурсамі і інфармацыйна-аналітычным інструментарыем, які выкарыстоўваюць бібліятэкі для прадстаўлення платных паслуг.

Адметнасць вучэбных дапаможнікаў па вучэбнай дысцыпліне «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» вызначаецца яе мэтавай тэхналагічнай накіраванасцю. Па сваім змесце, напаўняльнасці вучэбныя дапаможнікі – гэта «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці» [10] і «Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі» [11] С.В. Зыгмантовіч – арыентаваны не толькі на перадачу ведаў праз раскрыццё арганізацыйных, тэхналагічных, метадычных асаблівасцей ажыццяўлення розных працэсаў бібліяграфічнай работы, але і на раскрыццё і засваенне вопыта практычнай дзейнасці. Адукацыя не можа быць практыка-арыентаванай без набыцця вопыту дзейнасці. Вопыт дзейнасці ў вучэбным дапаможніку па дысцыпліне, якая разглядаецца, набывае статус дыдактычнай адзінкі, і традыцыйная трыада «знаниевого» падыходу дапаўняецца новай дыдактычнай адзінкай «веды – уменні – навыкі – вопыт дзейнасці». Вучэбныя дапаможнікі дапамагаюць праз вучэбна-пазнавальную дзейнасць пазнаёміцца не толькі з тэарэтыка-метадычнымі і тэхналагічнымі дасягненнямі ў сферы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, але і вопытам работы беларускіх бібліятэк, асаблівасцямі тэхналагічных працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці, сродкамі і метадамі, якія выкарыстоўваюцца, што накіраваны на атрыманне канкрэтных вынікаў работы ў выглядзе бібліяграфічных прадуктаў і паслуг з лепшымі іх узорамі, якія прыводзяцца ў дадатках падручнікаў.

Да вартасцей вучэбнага забеспячэння дысцыпліны «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» трэба аднесці таксама значнае ўзбагачэнне арганізацыйна-ўпраўленчага раздзела бібліяграфазнаўства. Ва ўсіх главах вучэбнага дапаможніка «Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэк», прысвечаных як агульным

пытанням кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі, рэалізацыі асноўных функцый кіравання (планаванню, уліку, справаздачнасці, аналізу бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк), маркетынгу ў сістэме кіравання, так і вывучэнню эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці, метадычнаму забеспячэнню гэтага віду дзейнасці ў бібліятэках, глыбока і паслядоўна раскрыты менавіта спецыфічныя рысы, асаблівасці кіравання адным з кірункаў дзейнасці бібліятэк.

С.В. Зыгмантовіч удалося не толькі даступна і лагічна выкласці асновы бібліяграфічнага менеджменту, але і ажыццявіць прырашчэнне ведаў па арганізацыйна-ўпраўленчым раздзеле бібліяграфазнаўства. Заслугоўвае ўвагі распрацоўка аўтарам пытанняў вызначэння спецыфікі кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю, асаблівасцей маркетынгавай арыентацыі вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі і паслуг, іх рэкламы, выкарыстання бібліяграфічнай інфармацыі як аднаго з важнейшых сродкаў рэкламы бібліятэкі, яе дакументных рэсурсаў, паслуг і інш., што вельмі важна было як для вучэбных, так і практычных мэтаў.

Падагульняючы, магчыма канстатаваць, што складанае ўзаемадзеянне навукі, бібліятэчна-бібліяграфічнай і педагагічнай практыкі плённа ўвасабляецца ў сістэме нацыянальных вучэбных выданняў. Сучасныя беларускія вучэбныя выданні ўтрымліваюць вучэбны матэрыял, які адаптуе для студэнтаў асноўныя дасягненні сучаснай навуковай думкі і перадавой бібліяграфічнай практыкі і прадстаўляе яго па важнейшых аспектах бібліяграфазнаўства. Аўтары вучэбных выданняў не толькі выразна прасочваюць праблематыку кожнага аспектнага кірунку, але і кантэкстна падтрымліваюць узаемасувязі паміж навуковымі дысцыплінамі, што важна для цэласнага засваення такой складанай галіны ведаў, як агульнае бібліяграфазнаўства. Гэта забяспечваецца выкарыстаннем сучаснай тэрмінасістэмы, арыентаванасцю на актуальныя тэарэтычныя, гістарычныя, арганізацыйныя, метадычныя, упраўленчыя і іншыя палажэнні і высновы, скіраванасцю на праблематыку нацыянальнай бібліяграфічнай сістэмы. Выкладчыкамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прадстаўнікамі беларускай навуковай школы па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве і кнігазнаўстве вядзецца работа над далейшым удасканаленнем вучэбна-метадычнага забеспячэння агульнага бібліяграфа-

знаўства. Вучэбныя дапаможнікі ўжо інтэграваны ў электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, у перспектыве – пераўтварэнне апошніх у адкрытыя вучэбныя сістэмы, якія дзякуючы новым электронным тэхналогіям могуць пастаянна ўзбагачацца; падрыхтоўка вучэбных крыніц з новымі дыдактычнымі магчымасцямі, якія дапамогуць студэнтам актыўна і творча ўдзельнічаць у бібліяграфічным пазнанні свету інфармацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Вохрышева, М. Г.** Учебник как форма представления профессионального знания / М. Г. Вохрышева // Библиотековедение. – 2016. – Т. 1, № 1. – С. 107–110.

2. **Адукацыйны** стандарт вышэйшай адукацыі. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 04 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) [Электронны рэсурс] // Режим доступа: Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь, 23.05.2015, 8/29871. – Дата доступа: 08.02.2018.

3. **Rzecz** o bibliografii powszechnej na otworzenie tego kursu w Cesarskim Uniwersytecie Wileńskim dnia 10 stycznia 1829 roku napisana przez Aleksandra Bohatkiewicza. – W Wilnie – Nakladem i drukiem A. Marcinowskiego 1830. Cenzura 24 – 1 – 1830 г. 16° str. 74.

4. **Толкачев, Н. Т.** Краткие основы библиографии : пособие для студентов высших учебных заведений / Н. Т. Толкачев. – Минск : Изд-во Мин-ва высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1963. – С. 32.

5. **Леончиков, В. Е.** Белорусская библиография. Общий курс : учебник. – Минск : Вышэйшая школа, 1983. – 238 с. ; В. Е. Лявончыкаў Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: падручнік / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1991. – 258 с.

6. **Кузьмініч, Т. В.** Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с.

7. **Коршунов, О. П.** Библиографоведение: учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общ. ред. О. П. Коршунова. – Санкт-Петербург: Профессия, 2014. – 288 с.

8. **Кузьмініч, Т. В.** Бібліяграфазнаўства … С. 9.

9. **Саітава, В. І.** Бібліяграфазнаўства. Гісторыя : вучэб. дапам. / В. І. Саітава, В. Е. Лявончыкаў, Т. В. Кузьмініч ; [пад агул. рэд. Т. В. Кузьмініч ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2017. – 248 с.

рованием понимает «метод исследования свойств объекта с помощью модели, основанный на приемах аналогии». По мнению ученого, он упрощает объект, представляет его в виде системы, удобной для изучения, с сохранением важнейших свойств. Моделью же библиотековед называет «искусственно созданный заместитель объекта» [1].

В свою очередь, Н.С. Редькина под моделированием деятельности библиотеки называет процесс, «позволяющий увидеть и изучить взаимосвязи, интегрировать процессы, системы, организационную структуру, информацию и данные, обеспечить последовательное представление технологических циклов и создать информативную среду для оценки возникающих проблем» [2].

Е.Н. Опекунова отмечает, что одной из проблем, с которой сталкиваются сегодня большинство университетских библиотек, является устаревание существующего набора показателей оценки их деятельности [3]. В сложившейся ситуации самым приемлемым решением видится апробация на библиотеках данного типа методического инструментария для проведения независимой оценки качества работы, разработанного в 2016 г. И.Б. Стрелковой [4]. В результате был просчитан «качественный» рейтинг университетских библиотек Беларуси, разработаны паспорт и программа формирования квалиметрической компетенции руководителей университетских библиотек. Таким образом, логическим завершением исследования, о котором речь шла и в предыдущем выпуске «Бібліятэчнага весніка», стала разработка квалиметрической модели деятельности университетских библиотек и определение педагогических условий ее реализации [5].

Квалиметрическое моделирование деятельности библиотеки учреждения высшего образования представляется как процесс оценки качества ее работы на основании сравнения с аналогами, имеющими наилучшие и наихудшие показатели.

Согласно различным классификациям, представляемая модель по области использования является опытной, динамической (по учету фактора времени), вербальной (по способу представления) и логической (по форме представления) [6]. Кроме того, данная модель является структурной, поскольку содержит сущностные

10. **Зыгмантовіч, С. В.** Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.

11. **Зыгмантовіч, С. В.** Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 123 с.

*Разглядаецца роля вучэбнай кнігі ў падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў; гісторыя стварэння нацыянальных вучэбных дапаможнікаў па асноўных раздзелах агульнага бібліяграфазнаўства ў Беларусі ў кантэксце развіцця профільнай навукі, бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі і сучасных патрабаванняў педагогікі да вучэбна-метадычнага забеспячэння падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў.*

*The role of the educational book in the training of library staff is considered; the history of the creation of national textbooks on the main sections of general bibliography in Belarus in the context of the development of core science, library and bibliographic practice and modern pedagogical requirements for the educational and methodological support for the training of library specialists.*

***Люцко Наталия Михайловна***
Национальная библиотека Беларуси

## КВАЛИМЕТРИЧЕСКАЯ МОДЕЛЬ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УНИВЕРСИТЕТСКОЙ БИБЛИОТЕКИ И ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ УСЛОВИЯ ЕЕ РЕАЛИЗАЦИИ

Усложнение работы университетских библиотек в настоящее время, связанное, прежде всего, с изменениями технологических процессов, появлением новых способов осуществления своей деятельности, существенно поднимает роль метода моделирования. Оптимизация технологических процессов в библиотеках побудила профессиональное сообщество отказаться от описательных методов в пользу метода моделирования. В.С. Крейденко под модели-